■ Узброеным Сілам — 100 гадоў

# АЙЧЫНЕ СЛУЖЫМ!

## Праект, прымеркаваны да юбілею беларускай арміі, падарожнічае па краіне



**Каля трох тысяч чалавек, у большасці сваёй школьнікі і студэнты, днямі бліжэй пазнаёміліся з сучаснай беларускай арміяй. У межах тэлевізійнага музычнага праекта Міністэрства абароны «Айчыне служым!», прымеркаванага да 100-годдзя Узброеных Сіл, пра тонкасці вайсковай службы, актуальнасць такіх адвечных паняццяў, як любоў да Радзімы і захаванне традыцый, яны даведаліся не толькі праз мастацтва.**

Вялікія чэргі каля экспазіцыйных стэндаў — склалася ўражанне, што тут бясплатна раздаюць гарачыя піражкі. На самай справе хлопчыкі і нават дзяўчаткі не адыходзілі ад стралковай зброі, якой карыстаюцца сённяшнія вайскоўцы. Падлеткам не цярпелася даведацца, на якую максімальную адлегласць розна лётае куля, выпушчаная з аўтамата Калашнікава, колькі часу неабходна, каб асвоіць снайперскую вінтоўку Драгунова, і, увогуле, дзе сёння вучаць снайпераў.

Васьмікласнікі 55-й сталічнай сярэдняй школы былі ў захапленні ад... бронекамізэлек. Так і засыпалі пытаннямі вайскоўца, які прадстаўляў экіпіроўку сіл спецыяльных аперацый. «Цікава, з чаго яны зроблены, якой зброяй іх можна прабіць, з якой адлегласці, — тлумачыць сваю цікаўнасць Дзіма. — Увогуле, мне падабаецца ўсё, што звязана з ваеннай тэматыкай».

З аднакласнікам пагаджаецца і Ваня. Падобнае падлетак бачыць не ўпершыню: разам з бацькам яны частыя госці на гістарычных рэканструкцыях, якія ладзяцца на Лініі Сталіна, неаднойчы былі і ў Беларускім дзяржаўным музеі гісторыі Вялікай Айчыннай вайны. На пытанне, ці плануюць звязаць сваё жыццё з арміяй, хлопцы ўпэўнена адказваюць: «А як жа! Калі не на прафесійнай аснове, то тэрміновую службу павінен адслужыць кожны сапраўдны мужчына!» Але перш той жа Дзіма паспрабуе налета паступіць у кадэцкае вучылішча.

Курсант факультэта ракетных войскаў і артылерыі Ваеннай акадэміі Кірыл Семяндзяеў, які на некалькі крокаў бліжэй на шляху да афіцэрскіх пагонаў, дасканала вывучаў прадстаўленыя ўзоры ваеннага адзення. «Думаю, у такой форме сучаснаму салдату будзе служыць камфортней», — перакананы юнак.

Невялікі натоўп і каля часовай карціннай галерэі. Маладыя людзі цікавяцца, хто адлюстраваны на палотнах (а гэта двойчы Героі Савецкага Саюза — ураджэнцы Беларусі), які подзвіг у гады Вялікай Айчыннай вайны яны здзейснілі.



Фота Дзяніса МАЛЬШЫЦА.

— Лепш адзін раз убачыць, чым сем разоў пачуць, — лічыць **кіраўнік студыі ваенных мастакоў, заслужаны дзеяч мастацтваў Беларусі Мікалай АПІЁК.** — Колькі мы ні казалі б, але калі чалавек бачыць выдатнага дзеяча на палатне, хочаш не хочаш, у думках ён знаёміцца з яго біяграфіяй.

Непадалёк размясцілася перасоўная мастацкая майстэрня. У сваіх палотнах, якія стварaліся тут жа, школьнікі адлюстроўвалі армейскую тэматыку. Пяцікласніца Марыя Зіновенка, напрыклад, пісала нацюрморт. Сярод кветак і садавіны яна «паклала» каску і аўтамат. «Гэтым я хачу сказаць, што Вялікая Айчынная вайна скончылася, мы пра яе памятаем, але краіна квітнее, развіваецца, і мы хочам, каб так было і далей», — кажа дзяўчынка.

Як адзначае мастак-баталіст, уласнік прыватнай мастацкай майстэрні Уладзімір Сайко, гісторыя беларускага войска ў розныя часы з'яўляецца асноўнай тэмай дзейнасці студыі. «Батальны жывапіс цікавы дзецям, бо для іх гэта нешта новае, — перакананы мастак. — Мы даносім да аўдыторыі ідэю пра тое, што ёсць беларус-сейбіт, працавіты чалавек, які мае ў сабе вялікую энергію, моц, але, калі пачынаецца пэўны канфлікт, беларус заўсёды адстойвае сваю пазіцыю. Ён не ваяўнічы, але, калі трэба, зможа за сябе пастаяць».

— Мы пабылі ў многіх гарадах, і, паверце, праект «Айчыне служым!» вельмі палюбіўся гледачу, — заўважае **мастацкі кіраўнік Акадэмічнага ансамбля песні і танца Узброеных Сіл, заслужаны артыст Беларусі палкоўнік Уладзімір ВАРАПАЕЎ.** — Гэта калі б'юцца ва ўнісон сэрцы артыста і гледача, калі мы адзін аднаго разумеем, што ў нас адна мэта — клопат пра любімую Радзіму.

Дарэчы, учора артысты ансамбля выступілі з канцэртнай праграмай «Айчыне служым!» у Пружанах, а ўжо ў аўторак плануюць парадаваць жыхароў Барысава.

**Вераніка КАНЮТА.**
*kanyuta@zviazda.by*

■ Людзі і лёсы

# СМАЛЯВІЦКАЯ КУПРЫЯНАВА

## Ваеннае ліхалецце адабрала ў Евы Чыбірай чацвярых сыноў. Яшчэ траіх — пакалечыла

**Была да вайны каля пасёлка Кастрычніцкі ў Смалявіцкім раёне невялікая вёсачка Астраўкі, якая з цягам часу злучылася з суседняй Лаўляй, а потым увогуле знікла з геаграфічнай карты. У Астраўках жыла Ева Чыбірай, якая здзейсніла матчын подзвіг: нарадзіла і выхавала дзевяцярых дзяцей — восем сыноў і дачку. Толькі зберагчы ўсіх не дала Вялікая Айчынная вайна...**

Шматдзетная сям'я жыла небагата, але дружна. Усе дзеці з малых гадоў вучыліся працаваць на зямлі. У школу хадзілі ў суседнюю Плісу. Вучылася там і жыхарка Смалявічаў Таццяна Стануль, у вайну сувязная партызанскай брыгады «Разгром».

— Малодшых дзяцей я ведала добра, — узгадвае жанчына. — Іх бацька, Антон Чыбірай, працаваў у мясцовым калгасе конюхам, маці, Ева Міхайлаўна, выхоўвала дзяцей. Сыны вучыліся і па чарзе ішлі ў армію. Добра памятаю Аляксандра: падчас вайны ён быў у нашай партызанскай брыгадзе.

### Пайшлі служыць

Бяда ў сям'ю прыйшла нечакана. Аднойчы Антона Чыбірая вельмі моцна стукнуў капытом конь. Пасля хваробы ён ужо не паправіўся і ў 1933 годзе памёр. Ева Міхайлаўна стала ўдавой у 45 гадоў. Незадоўга да гэтага нарадзіўся самы малодшы сын Іван.

Пасля бацькавай смерці апорай для маці стаў старэйшы Міхась, якому споўнілася 21 год. Хлопец працаваў слесарам-механікам на



Легендарная жанчына, сямёра сыноў якой набліжалі Вялікую Перамогу.

Смалявіцкай МТС. Адтуль у 1934 годзе Міхася прызвалі ў Чырвоную Армію, накіравалі ў школу малодшых камандзіраў. Ён з дзяцінства любіў тэхніку, цікавіўся ёю, таму не дзіва, што вучыўся ў ваенна-інжынерным вучылішчы, адкуль выйшаў малодшым лейтэнантам.

Тым часам палітычнае становішча ў Еўропе з кожным днём пагаршалася. 1 верасня 1939 года нападам гітлераўскіх войскаў на Польшчу пачалася Другая сусветная вайна. Савецкі ўрад пачаў умацоўваць баяздольнасць арміі, рыхтаваць кадры. Адзін за другім у армію пайшлі Пётр, Мікалай, браты-двайняты Адам і Уладзімір Чыбіраі.

### Страчаныя дзеці

Першая «пахаванка» прыйшла ў студзені 1940 года на Пятра, які загінуў падчас савецка-фінскай вайны. Праз год пачалася Вялікая Айчынная, і Смалявіцкі раён на доўгія тры гады апынуўся ў акупацыі. Увесь гэты час Ева Міхайлаўна нічога не ведала пра лёс сваіх дзяцей, якія пайшлі служыць.

Пад Масквой паклаў галаву другі сын — Мікалай. Міхась сустрэў ворага на мяжы ў самым пачатку вайны, ваяваў у Сталінградзе і на Курскай дузе, удзельнічаў у баях за Берлін. Быў узнагароджаны медалём «За адвагу». Пасля не першага, але цяжкага ранення на перадавой чатыры месяцы лячыўся ў шпіталі. Пасля вайны служыў у Германіі.

Апошнім праводзіла маці на вайну Сяргея, які пайшоў на фронт пасля вызвалення Беларусі. Вярнуўся. Увесь параненых, але жывы. Як расказвае яго дачка Раіса Камоцкая, пасля ранення ў жывот у бацькі не было паловы страўніка. «Адна рука была перабіта і пакалечана, — успамінае жанчына. — Ён увесь хворы быў. Кожную вясну і восень ляжаў у шпіталі ў Бараўлянах, дзе папраўляў здароўе. Ваенныя гады, раненні і хваробы забралі яго ў нас у 1972 годзе...»

Двайняты Адам і Уладзімір Чыбіраі трапілі на фронт пасля кадравай службы ў Чырвонай Арміі. Ваявалі ў Сталінградзе, былі сувязістамі, але ў розных часцях.

Пасля вайны старэйшы брат Міхась цікавіўся іх лёсам. Па яго ўспамінах, маці атрымала «пахаванку» на Адама, а таксама ліст ад камандзіра дывізіі, у якім было напісана: «Ваш сын быў радавым сувязістам. Ён знаходзіўся ў самай гушчы бою, дзе злучаў перабітыя правады, яму мінай раздрабніла руку. Трацячы прытомнасць, ён паднёс канцы правадоў да зубоў і так забяспечыў сувязь». Адам Чыбірай быў пасмяротна ўзнагароджаны ордэнам Айчыннай вайны.

Подзвіг Адама, які аднавіў сувязь і памёр з провадам у зубах, быў шырока вядомы ў Сталінградзе. Па баявых пазіцыях нават хадзілі рукапісныя лістоўкі з апісаннем яго ўчынку і заклікам адпомсціць за байца.

Уладзімір вярнуўся ў родную вёску інвалідам. Здароўе, страчанае на франтах, не дазволіла яму паўнавартасна жыць і працаваць пасля вайны. Уладзімір сышоў з жыцця ў 1961 годзе.

Аляксандр быў самы малодшы з братоў, якія ваявалі з фашыстамі. Апошнім і загінуў. Але мог жыць ды жыць... У армію яго не бралі з-за ўзросту, але ён добраахвотна стаў дапамагаць партызанам. У 17 гадоў ён загінуў. Было тое незадоўга да вызвалення Беларусі... Імя патрыёта выбіта на стэле брацкай магілы на партызанскіх могілках у Стрыева.

### Век у адзіноце

Пасля вайны Ева Міхайлаўна жыла з дачкой Верай і малодшым сынам Іванам у Астраўках. Усе гэтыя гады маці цярпліва несла свой крыж: плакала, калі прыйшлі весткі пра гібель чацвярых сыноў, і радавалася, калі вярнуліся жывымі трое яе зраненых і пакалечаных дзяцей. Праз некаторы час малодшы Іван пайшоў вучыцца ў мараходку ў Калінінград, трапіў на Далёкі Усход, там і застаўся. Шмат гадоў плаваў на розных караблях, а ў канцы 1980-х пераехаў з сям'ёй з Магадана ў Мінск. Вера неўзабаве захварэла і не магла дапамагаць маці.

Жанчына, якая нарадзіла дзевяцярых дзяцей, вымушана была адна дажываць свой век у Астраўках. Калі ёй спатрэбіўся догляд, Міхась напісаў ліст міністру абароны з просьбай дапамагчы яго маці. Жанчыну ўладкавалі ў Лагойскі дом састарэлых, адзін з лепшых на той час. Там яна была забяспечана доглядам, добрым харчаваннем і медыцынскім абслугоўваннем.

Тут, на лагойскай зямлі, яна і сышла ў іншы свет. Магілу жанчыны даглядалі школьнікі. Але амаль за паўстагоддзя помнік струхлеў і стаў разбурацца. Па ініцыятыве Лагойскай раённай ветэранскай арганізацыі і аб'яднання прафсаюзаў было прынята рашэнне аб стварэнні новага помніка, які быў усталяваны сёлета да Дня Перамогі. Пасмяротна гэтая легендарная жанчына была ўзнагароджана ордэнам «Вялікая Перамога» — як маці сямі сыноў, якія ваявалі на вайне і ўнеслі свой уклад у Вялікую Перамогу.

**Аляксандр ПАЎЛЮКОВІЧ,**
*г. Мінск*